# Школьнае лясніцтва «Лясная акадэмія»

Сучасны свет развіваецца шалёнымі тэмпамі, але пры гэтым на першы план выходзяць пытанні беражлівых адносін да прыроды, прыродныхрэсурсаў. Асабліва важным становіцца экалагічнае выхаванне, прыродаахоўная і лесаводчая адукацыя. І задача дарослых - з дзяцінства прывіваць дзецям сістэму каштоўнасцяў, якая дазволіць вырасціць годнае пакаленне, здольнае з любоўю і павагай ставіцца да прыроды і яе дарам.

Школьныя лясніцтва - адна з самых эфектыўных форм выхавання падрастаючага пакалення ў разрэзе беражлівых адносін да прыроды,фарміравання экалагічнага мыслення, асваення базавых навыкаў у сферылесакарыстання.

Школьнае лясніцтва **«Лясная акадэмія»** створана на базе дзяржаўнай установы адукацыі Браслаўская сярэдняя школа №2 і знаходзіцца пад куратарствам Нацыянальнага парку «Браслаўскія азёры».



Удзельнікі «Лясной акадэміі» - актыўныя, ініцыятыўныя школьнікі, якія поўныя імкненняў спазнаваць, тварыць, дапамагаць. Кіраўніцтва школы і нацыянальнага парку горача падтрымлівае смагу дзейнасці падлеткаў, бо менавіта так гартуецца характар, выхоўваецца самастойнасць, закладваюцца асновы свядомых паводзін, ствараюцца перадумовы для самарэалізацыі і самавыяўлення.

Значэнне лесу ў народнай гаспадарцы, ахова лесу, абарона лесу ад шкоднікаў і хвароб, догляд за лесам і лесакарыстанне - асноўныя напрамкі работы са школьнікамі. Акрамя таго, дзеці залучаюцца ў удзел у акцыях, конкурсах, мерапрыемствах, звязаных з лес аховай і лесакарыстаннем: догляд за ляснымі культурамі, выраб шпакоўняў, уборка тэрыторый і многае іншае.

Можна з упэўненасцю сказаць, школьнае лясніцтва фарміруе ўсвядомленую асобу, здольную актыўна ўдзельнічаць у прыродаахоўнай дзейнасці . І менавіта таму праца «Лясной акадэміі» асабліва важная.









*Матэрыял падрыхтаваў: мл. навуковы супрацоўнік Валошына А.Р.*